# МУЖНЫ САЛДАТ І САПРАЎДНЫ ГРАМАДЗЯНІН

Эскадрылля, у якой намеснікам камандзіра быў маёр Пушкарт, прыбыла ў Афганістан у 1983 годзе. І гэта быў час асабліва жорсткіх баёў. Хуткія і манеўраныя верталёты "Мі-8" і "Мі-24" з'яўляліся асноўнай ударнай сілай. Лётчыкі суправаждалі калоны, вывозілі параненых і забітых, аказвалі агнявую падрыхтоўку пехацінцам, дастаўлялі ў горы дэсантнікаў і самі вялі баі.

Адзін з баёў адбіўся ў памяці Івана Іванавіча назаўсёды. У дзвюх пячорах, размешчаных на супрацьлеглых яе баках, знаходзілася вучэбная база душманаў.

І нічым нельга было выкурыць бандытаў адтуль. Бомбы толькі адбівалі шчабёнку ў горнай пародзе. І камандаванне прыняло рашэнне: ліквідаваць базу сіламі дэсанта. Ліквідавалі. Толькі з 20 верталётаў, якія ўдзельнічалі ў той аперацыі, цэлымі на базу вярнуліся 2. У тым баі загінуў саслужывец Івана Іванавіча па Беларусі і лепшы сябра ва ўсе часы Леанід Бяліцкі. Гэта здарылася ўсяго за два тыдні да вываду эскадрыллі з Афганістана.

***Л. Арлова***

*Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). — 2003. — 14 лют. — С. 2.*